*А. Я. Паўлава*
(Мінск)

**Асветніцкая дзейнасць
Дзяржаўнага мастацкага музея БССР (1944–1984 гг.)**

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (менавіта так з 1993 г. пачаў называцца Дзяржаўны мастацкі музей БССР) сёння можна назваць адным з самых папулярных музеяў краіны. Нягледзячы на значны ўклад у культурнае развіццё краіны, гісторыя дзейнасці музея недастаткова поўна прадстаўлена ў працах айчынных даследчыкаў. Між тым комплекс архіўных дакументаў аб дзейнасці Дзяржаўнага мастацкага музея БССР сведчыць, што сучасныя супрацоўнікі Нацыянальнага мастацкага музея (пад кіраўніцтвам У. І. Пракапцова) прытрымліваюцца лепшых традыцый сваёй установы, закладзеных «душой музея А. В. Аладавай», Ю. А. Карачуном, калектывам энтузіястаў у часы адраджэння музея пасля Вялікай Айчыннай вайны і на працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў, заснавальнікаў першага беларускага музея Я. і К. Тышкевічаў.

Дакументальныя крыніцы па гісторыі стварэння і дзейнасці сённяшняга Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь знаходзяцца ў трох архіўных комплексах: Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтваў (БДАМЛМ) і архіве Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі (НММБ). У складзе БДАМЛМ улічаны фонд № 164 «Дзяржаўны мастацкі музей БССР». Агульная колькасць спраў фонду – 331, якія ахопліваюць перыяд з 1944 г. па 1984 г. Знаёмства са справаводчай дакументацыяй мастацкага музея дазваляе прасачыць асветніцкую дзейнасць музея на працягу чатырох дзесяцігоддзяў.

З мэтай высвятлення магчымасцей выкарыстання дакументацыі ў якасці крыніцы па гісторыі дзейнасці музея было праведзена вывучэнне матэрыялаў на аснове 20-працэнтнай выбаркі. Вынікі праведзенага даследавання прадстаўлены ў дадзеным артыкуле. Найбольшая частка матэрыялаў фонду прысвечана культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Пры вывучэнні дакументацыі высветлілася, што на працягу азначанага перыяду гэтая дзейнасць называлася па-рознаму ў залежнасці ад задач музея ў вызначанай галіне: у 1949 г. – палітыка-асветніцкая; у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1954 г. – культурна-масавая і асветніцкая работа; у 1959 г. да дадзеннага віду дзейнасці па дакументах музея аднесены навукова-асветніцкая, лекцыйная работа, работа з масамі і з навучальнымі ўстановамі; у 1964 г. вызначаны кірунак мае назву масава-папулярызатарская работа. Менавіта такая назва захоўваецца ў планава-справаздачнай дакументацыі з 1964 г. па 1984 г.

Да 1957 г. Дзяржаўны мастацкі музей БССР не меў уласнага будынка. Акрамя таго, першае пасляваеннае дзесяцігоддзе дзейнасці музея было прысвечана аднаўленню страчанай у выніку вайны калекцыі. Адпаведна большая частка выстаў з'яўляліся перасоўнымі. Аднак з другой паловы 1950-х гг. музей арганізоўваў пастаянныя і перасоўныя выставы з асабістых фондаў і калекцый іншых музейных устаноў СССР і замежжа.

Для паспяховай рэалізацыі адукацыйнай функцыі, асветніцкіх праграм, распрацоўкі методык і зместу канкрэтных выстаў у музеі вывучалася музейная аўдыторыя. У большасці штогадовых справаздач выдзяляліся наступныя групы наведвальнікаў: рабочыя і служачыя, школьнікі, студэнты, ваеннаслужачыя, катэгорыя бясплатных наведвальнікаў. Асобныя групы дадаткова складалі настаўнікі, слухачы ўніверсітэтаў культуры і калгаснікі. Аднак асноўнымі катэгорыямі слухачоў былі школьнікі, удзельнікі ўніверсітэтаў культуры, настаўнікі, вайскоўцы, рабочыя і служачыя [3, арк. 152].

У плане музея, напрыклад, на 1959 г. адзначаецца, што калектыў працаваў так, каб максімальна задавальняць запыты людзей у пашырэнні і паглыбленні ведаў у галіне выяўленчага мастацтва, выхоўваць і развіваць эстэтычныя густы. Прадугледжваліся канкрэтныя заданні па прыцягненні ў музей рабочых прамысловых прадпрыемстваў Мінска, вайскоўцаў, навучэнцаў школ і ВНУ. Вялікая ўвага надавалася выставачнай і лекцыйнай рабоце ў калгасах, абласных і раённых цэнтрах Беларускай ССР. Калектыў навуковых супрацоўнікаў распрацаваў шэраг тэматычных лекцый і экскурсій для школьных груп, праводзіў метадычныя семінары для педагогаў аб формах азнаямлення навучэнцаў з выяўленчым мастацтвам [1, арк. 1].

За 1959 г. колькасць наведвальнікаў музейных выстаў склала 31 369 чалавек. Супрацоўнікамі музея праведзена 447 экскурсій і 109 індывідуальных кансультацый па экспазіцыі музея. 53 лекцыі былі прачытаны за першае паўгоддзе. 13 з іх прачытаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў музеі, 19 – ва ўніверсітэтах культуры, астатнія былі прачытаны на выбарчых участках, прадпрыемствах і завадскіх Дамах культуры.

Акрамя лекцый, праводзіліся сустрэчы, прысвечаныя выяўленчаму мастацтву, падчас якіх абмяркоўваліся пытанні арганізацыі перасоўных выстаў у вытворчых памяшканнях і магчымасці арганізацыі радыёзаняткаў па мастацтве з выкарыстаннем ўнутраных фабрычных радыёвузлоў [1, арк. 17]. З мэтай папулярызацыі мастацтва навуковыя супрацоўнікі музея на працягу 1959 г. наведалі 87 прадпрыемстваў, сярод якіх завод аўтаматычных ліній, аўтазавод, трактарны завод і інш.

Для пашырэння магчымасцей простых людзей пазнаёміцца з гісторыяй, кірункамі і творамі мастацтва мастацкі музей арганізоўваў пастаянныя кіналекторыі, якія праводзіліся ў Зялёным тэатры парка культуры імя М. Горкага і на трактарным заводзе. Перад дэманстрацыяй навуковых кінастужак адбываліся сустрэчы наведвальнікаў з супрацоўнікамі музея [1, арк. 19].

Работа на выбарчых участках была выдзелена ў асобны кірунак. Навуковыя супрацоўнікі музея наведвалі выбарчыя камісіі, дзе выступалі з лекцыямі аб мастацкім музеі і яго калекцыі. Толькі за люты 1959 г. супрацоўнікамі музея было праведзена 12 экскурсій па экспазіцыі. У гэтым жа годзе ў практыцы культурна-асветніцкай дзейнасці музея ўпершыню была выкарыстана такая форма дзейнасці, як дзень адкрытых дзвярэй. Праводзіліся сустрэчы з мастакамі і скульптарамі, на гэтыя сустрэчы былі запрошаны прадстаўнікі розных катэгорый наведвальнікаў: школьнікі, сябры гуртка выяўленчага мастацтва Палаца піянераў, настаўнікі школ, слухачы партшколы і інш. Прыкладна такія мерапрыемствы праводзіліся кожны год.

Музеем значна перавыкананы план па наведвальнасці экскурсій і лекцый за 1963 г. У 1964 г. працягвалася выкарыстанне такой формы дзейнасці, як дні адкрытых дзвярэй. Падобныя мерапрыемствы былі арганізаваны для работнікаў завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, кандытарскай фабрыкі «Камунарка», радыёзавода, камвольнага камбіната. Уваход на гэтыя мерапрыемствы адбываўся па запрашальных білетах. Папулярнасцю карысталіся і сустрэчы наведвальнікаў музея з мастакамі. У прыватнасці, падчас правядзення рэспубліканскай выставы да 45-годдзя ўтварэння БССР адбылося 17 сустрэч. За 1964 г. прачытана 571 лекцыя для розных груп наведвальнікаў [3, арк. 153].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з папулярных форм адукацыйнай дзейнасці ў пасляваенны перыяд стала арганізацыя ўніверсітэтаў культуры. У 1964 г., напрыклад, музей правёў восем заняткаў універсітэта культуры па выяўленчым мастацтве, былі арганізаваны выязныя лекторыі для школьнікаў у Барысаве і Дараганаве. У першым квартале 1969 г. падобныя заняткі па экспазіцыі музея праводзіліся з супрацоўнікамі домаўпраўлення №20 г.Мінска. Для слухачоў універсітэтаў культуры і звычайных наведвальнікаў 28 красавіка 1974 г. праводзілася ўрачыстая вечарына да 150-годдзя з дня нараджэння У. В. Стасава пад назвай «У. В. Стасаў – мастацкі і музычны крытык». З нагоды 130-годдзя з дня нараджэння І. Я. Рэпіна супрацоўнікамі музея прачытаны 13 лекцый для школьнікаў і слухачоў Мінскай ВПШ [6, арк. 10]. Для супрацоўнікаў Мінскага гарвыканкама былі арганізаваны лекцыйныя заняткі па тэме «Народныя мастакі Беларусі». Н. Ф. Высоцкая пазнаёміла супрацоўнікаў Дома работнікаў мастацтваў з асаблівасцямі мастацтва Старажытнай Русі. Неабходнасць працаваць у русле тагачаснай ідэалогіі патрабавала і адпаведных лекцый. Адной з такіх ідэалагічных лекцый стала «У. І. Ленін у выяўленчым мастацтве».

Вялікая ўвага надавалася папулярызацыі ведаў аб выяўленчым мастацтве сярод жыхароў сельскай мясцовасці. Калгаснікі знаёміліся з шэдэўрамі сусветнага і айчыннага мастацтва. Так, у калгасе імя М. Гастэла б. Радашковіцкага раёна ім былі прачытаны лекцыі на тэмы «Творчасць Леанарда да Вінчы» і «Творчасць Рубенса», а ў Радашковічах – лекцыя «Прыкладное мастацтва Беларусі» [4, арк. 3].

З мэтай папулярызацыі мастацтва сярод рабочых і служачых на працягу, напрыклад, 1974 г. супрацоўнікі музея актыўна праводзілі на прадпрыемствах лекцыі па гісторыі рускага мастацтва, беларускім народным мастацтве і асаблівасцях успрымання жывапісу. Такія сустрэчы адбыліся, напрыклад, на камвольным камбінаце і фабрыцы мастацкіх вырабаў г. Мінска. На базе музея для пашырэння ведаў насельніцтва ў галіне мастацтва былі арганізаваны Стасаўскія чытанні і сустрэчы ў залах экспазіцыі беларускага савецкага мастацтва [5, арк. 1]. Супрацоўнікі музея прымалі ўдзел у семінары мастакоў і народных майстроў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці. І. Н. Паншына, у прыватнасці, выступала з дакладамі «Перспектывы развіцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народных мастацкіх промыслаў у Беларусі» , Т. І. Сцешына – з дакладам «Беларускае народнае мастацтва».

Акрамя разавых лекцый, музей арганізоўваў больш грунтоўнае паглыбленне ведаў насельніцтва ў галіне выяўленчага мастацтва. Спецыялізаваныя лекторыі дзейнічалі для рабочых аўтамабільнага завода («Віды і жанры выяўленчага мастацтва»), супрацоўнікаў НДІ парашковай металургіі, студэнтаў політэхнічнага інстытута («Знакамітыя майстры рускага мастацтва») і інш.

Сярод мерапрыемстваў 1979 г. вызначаюцца сустрэчы наведвальнікаў з мастакамі Л. Д. Шчамялёвым і В. К. Громанавым падчас персанальных выстаў [7, арк. 31]. У 1984 г. да ўжо пазначаных раней форм культурна-адукацыйнай дзейнасці далучаюцца лекторыі выхаднога дня.

Вывучэнне архіўных дакументаў фонду № 164 паказала, што кіраўніцтва Дзяржаўнага мастацкага музея БССР дастаткова ўвагі надавала інфармаванню насельніцтва аб праводзімых ім мерапрыемствах. Зараз уся рэкламная прадукцыя захоўваецца ў архіве Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Першыя ўзгадванні рэкламнай дзейнасці адносяцца да канца 1940-х гг. Напрыклад, у другой палове 1950-х гг. музей друкаваў плакаты і афішы, якія былі расклееены на гарадскіх рэкламных шчытах, напісаны і перададзены ў друк шэраг артыкулаў. Супрацоўнікамі музея быў падрыхтаваны спецыяльны рэкламны артыкул аб музеі, яго калекцыях і выставах для даведніка па г. Мінску [1, арк. 21]. З мэтай павелічэння наведвання музея дзецьмі школьнага ўзросту ў 1959 г. была распрацавана, выдадзена і распаўсюджана ўлётка, у якой у даступнай форме распавядаліся прапановы музея па арганізацыі тэматычных экскурсій для вучняў рознага ўзросту. Улёткі і афішы музея распаўсюджваліся і падчас правядзення метадычных і патрыятычных нарад для супрацоўнікаў устаноў адукацыі. Падчас прыгаданых нарад навуковыя супрацоўнікі музея праводзілі для слухачоў азнаямляльныя рэкламныя экскурсіі [1, арк. 20].

Акрамя вышэйадзначаных, да формаў рэкламы, выкарыстаных музеем, напрыклад, у 1964 г., трэба аднесці традыцыйныя вулічныя афішы і радыёаб’явы аб усіх мерапрыемствах, што праходзілі ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. На працягу наступных гадоў кола формаў рэкламы пашыралася. У 1969 г. сведчанні аб рэкламнай дзейнасці традыцыйна былі размешчаны ў блоку папулярызацыі. Для распаўсюджвання інфармацыі аб мерапрыемствах музей усё часцей выкарыстоўваў тэлебачанне [4,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арк. 5]. Так, ужо ў 1974 г. для інфармавання аб выставах і іншых падзеях былі задзейнічаны ўсе магчымыя сродкі: рэкламны шчыт перад музеем, афішы ў горадзе, аб'явы ў газеце «Вячэрні Мінск», тэлеперадачы і радыёаб'явы.

Такім чынам, згодна з вывучанай дакументацыяй архіўнага фонду, яшчэ ў савецкі перыяд супрацоўнікі музея праводзілі вялізарную культурна-адукацыйную работу па папулярызацыі мастацтва сярод насельніцтва БССР. Музей выкарыстоўваў разнастайныя формы дзейнасці. Сённяшні поспех Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь закладзены шматгадовай працай калектыву сапраўдных прафесіяналаў сваёй справы.

---


1. *Беларускі* дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 164 «Дзяржаўны мастацкі музей БССР». – Воп. 1. – Спр. 83.

2. Там жа. Спр.127.

3. Там жа. Спр.135.

4. Там жа. Спр.174.

5. Там жа. Спр.214

6. Там жа. Спр.217.

7. Там жа. Спр.269.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ